Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 141 (523) Аўторак, 20 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

„Амэрыка“, якую адчыніў чашніцкі поп.

Сем тысяч крыжоў і паўтара мільёны рублёў за цуда.

ВЧК--ДПУ.

Гэтымі днямі споўнілася 10 год са дня організацыі ВЧК—ДПУ, гэтага вернага вартаўніка заваёў Кастрычнікавай рэволюцыі.

У дні, калі пролетарыят, захапіўшы ўладу ў свае рукі, пачаў будаваць новы апарат новай улады—пачалі наступаць ворагі.

Маладая савецкая краіна аказалася ў жалезным, крывавым коле шматлікіх франтоў.



Арганізатар ДПУ тав. Дзяржынскі.

Акрамя барацьбы з яўным ворагам трэба было таксама пачаць рашучую барацьбу з унутраным, скрытым ворагам, які спрабаваў узарваць савецкую краіну з сярэдзіны, абкружыўшы яе густою сеткаю ш п і я н а ж у, здрадніцтва, правакацый і паўстаньняў. Спачатку Чырвоная гвардыя, а потым рэгулярныя часьці Чырвонай арміі павялі паьспешную барацьбу на ваенных франтох. І чым значней былі нашы перамогі на ваенных франтох, тым упарцей нас старэліся ўзарваць з сярэдзіны.

І барацьба з гэтай рознавыгляднасьцю контр-рэволюцыі была ўскладзена на новую ўстанову—ВЧК.

Вось пастанова СНК ад 20-га сьнежня 1917 году, на падставе якой ВЧК пачала існаваць.

«Назваць камісію—усесаюзнай надзвычайнай камісіяй пры СНК па барацьбе з контр рэволюцыяй, саботажам і вацьвердзіць яе. Задачы камісіі: 1) Прасьледаваць і ліквідаваць ўсе контр-рэволюцыйныя саботажніцкія спробы і дзейнасьць па ўсёй Расіі, з боку каго-б там яны ня выходзілі; 2) Аддаць суду рэволюцыйнага трыбуналу ўсіх саботажнікаў, контр-рэволюцыянэраў і выпрацаваць меры барацьбы з імі.

Гэтыя тры выразныя літары **ВЧК—ДПУ** упісалі шмат слаўных, незапамятных старонак у гісторыю барацьбы за заваёвы Кастрычніка.

На ВЧК—ДПУ з боку ворагаў працоўнай клясы сыплюцца найцяжкія абвінавачваньні, праца ВЧК—ДПУ абліваецца памыямі паклёпу і брахні.

Але недарма ёсьць прыказка: «Калі **ворагі** мяне **хваляць**, дык трэба паглядзець, ці не нарабіў я глубства».

Ворагі нас—нашу ВЧК—ДПУ—ня хваляць таму, што чэкісты поўнасьцю выконваюць свой рэволюцыйны абавязак. выконваюць волю пролетарыяту.

У цяжэйшыя дні, калі вораг насядаў на Савецкі Саюз, тав. Ленін гаварыў:

«Контр-рэволюцыянэры, саботажнікі гэта—атрады, купленыя буржуазіяй, якая засыпае падарункамі сабоціруючых чыноўнікаў, абвясьціўшых барацьбу з Савецкай уладай у гонар панаваньня рэакцыі. Тое зьявішча, што народ з пляча рубіць сялянскімі і рабочымі сякерамі буржуазію,—гэта зьявішча ім здаецца беспраўдным сьветапрастаўленьнем і беспаваротнай гібельлю ўсяго. Калі мы вінаваты ў чым небудзь, дык гэта ў тым, што мы былі вельмі гуманны, вельмі добрапарадачны ў адносінах да страшэнных па свайму здрадніцтву прадстаўнікоў буржуазна-імпэрыялістычнага ладу».

Многа бальшавікоў і комсамольцаў аддалі сваё жыцьцё за рэволюцыю, змагаючыся ў шэрагах ВЧК—ДПУ.

Комсамольская організацыя павінна вучыцца на слаўных чэкісцкіх традыцыях, вучыцца, як трэба абараняць і ахоўваць сваю краіну.

Гарачае братэрскае прывітаньне нястомным вартаўніком Савецкага Саюзу—ад Ленінскага Комсамолу Беларусі.

Дзесяцігодзьдзе ВЧК-АДПУ.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі рабочая кляса, супольна з працоўным сялянствам скінула ў Кастрычніку 1917 г. уладу буржуазіі і паноў і іх прыхвасьняў—афіцэрства, кадэтаў, эсэраў і меншавікоў. У першыя дні Кастрычніка, уся контр-рэволюцыя прытаілася. Але не пасьпела рабочая кляса перавязаць раны пасьля кастрычнікавых баёў, як ворагі рэволюцыі пачалі ўзьнімаць галовы і пасягаць на дыктатуру пролетарыяту.

Уладзімір Ільліч, прадбачачы, што рэволюцыі пагражае небясьпека з боку ўзрастаючай контр-рэволюцыі, на адным з пасяджэньняў Саўнаркому прапанаваў утварыць орган, здольны весьці рашучую барацьбу проці мяцежнікаў. І ў 1917 годзе 20 сьнежня народзілася **Усерасійская Надзвычайная Камісія**, а на чале гэтага баявога органу быў паstаўлен **Фэлікс Эдмундавіч Дзяржынскі**, цьвёрды і адданы пролетарскай рэволюцыі бальшавік. Гэта прызначэньне цалкам адпавядала духу і накіраваньню працы ВЧК. Іменна **Дзяржынскі**, як рэволюцыянэр, вынесшы ўсе цяжкасьці падпольля, прайшоўшы ссылку і турмы, чалавек, маючы організатарскія здольнасьці і жалезную непарушную волю, мог сабе апраўдаць на пасту старшыні ВЧК.

ВЧК—АДПУ—караючы меч пролетарыяту бязьлітасна абрушваўся на галовы тых, хто пасьмеў пасягаць на заветы Кастрычніка, на дыктатуру пролетарыяту, на Савецкую ўладу і на плана сацыялістычнае будаўніцтва.

За тры гады працы органаў ВЧК (пэрыод грамадзянскай вайны) выкрыта і ліквідавана вялікая колькасьць шпіёнскіх організацый і белагвардзейскіх загавораў, як, напрыклад, «Усерасійскі манархічны саюз», «Нацыянальны Цэнтр» і інш. Сваёй мэтай гэтыя організацыі ставілі зьнішчэньне савецкай ўлады і ўстанаўленьне манархіі.



Тав. Менжынскі, старшыня ДПУ СССР.

З буйных паўстаньняў, меўшых месца ў СССР і з вялікім напружаньнем ліквідаваных, трэба адзначыць Яраслаўскае і Кранштадскае. Загавор на Чырвонай Горцы, як раз тады, калі дэнікінская армія падыходзіла да Арла, а юдзеніцкая белая армія да Ленінграду—патрабаваў вялікай напружанай сілы для ліквідацыі гэтага загавору.

Пры ліквідацыі ўсіх, названых вышэй контр-рэволюцыйных організацый чэкісты выявілі сваю непарушнуму цьвёрдасьць і рашучасьць, суровасьць і строгасьць да сябе.

Так ажыцьцяўляліся слаўныя гэроічныя старонкі ў гісторыі ВЧК у пэрыодграмадзянскай вайны. Калі ў 1922 г. пагроза небясьпекі да некаторай меры мінавала, ВЧК была пераіменавана ў Дзяржаўную Політычную Управу.

„Маліцеся і вайны ня будзе“

(Чашнікі, Віцебская акруга).

Надыходзіў Кастрычнік...

Усе рыхтаваліся да сьвята. Кожны стары і малы радаваўся, гледзячы на пройдзены шлях, падмацоўваў сваю радасьць простымі фактамі паляпшэньня жыцьця свайго, з агідай успамінаў былыя царска-панскія парадкі.

... Глядзеў спадцішка на ўсё гэта чашніцкі поп, касіўся, задумённа чухаў пяцярнёй валасатую патыліцу і думаў. Не пра тое думаў, што вось калядкі надыходзяць, у хляве прыбавіцца парасятак і курэй, у клеці—сала і каўбас. Поп думаў, што-б ужыць такое, каб хоць частачку вярнуць сабе—у царкву—ранейшай арміі «парафіян». Было нудна папу. Яго аблітае горка-салёнымі сьлязьмі сэрца губляла рытмічнасьць звароту крыві: то стукала з хуткасьцю кулямётных стрэлаў, то прыціхала, як у паміраючага чалавека.

Надумаўся чашніцкі поп пропаведзі ў царкве чытаць. З якой тэмы распачаць? Што больш хвалюе сялян?

Вайна. Яна заўсёды зьнішчала тысячы людзей, яна прымушала сялян часьцей наведваць царкву, больш маліцца, зьбіраць больш ахвяраваньняў для малебнаў аб міру.

Прапяяўшы кучцы сабраўшіхся старых баб і дзядоў «цару нябесны» і «отча наш», поп пагладзіў сваю рыжаватую бараду, залажыў абвіслыя пасмы валос за пасінелыя вушы і пачаў:

— **«Шаноўны народ! Мы прывыклі далей свайго носу нічога ня бачыць. Вы капаецеся там у сваіх хатах, ператвараеце нінашто дар божы—хлеб, і думаеце, што ўсюды пануе лад і спакой. Узглянеце на бальшавікоў сваіх, як яны навучаюцца ваеннай справе, як яны рыхтуюца да вайны. Нам—мірнаму народу—вайна пагражае.**

Народ! Заклікаю вас імем усявышняга маліцца і маліцца! Толькі шчырай аплаканай сьлязьмі і крывёй малітвай, выказанай у храме божым, мы заробім ад усемагучага пашану і ласку»!

Прамова цягнулася доўга, ілюстравалася папоўскім «госпадзі памілуй», «падай госпадзі», «слава ўсявышняму».

* * *

Яшчэ ў царкве запала ў галаву Мікіты крупінка пераканананасьці ў тым, што поп хлусіць. Ён і ў царкву прышоў толькі так сабе, на ўсякі выпадак.

Вышаў ён з сваёй бабай з царквы і погляд яго прысьляпаватых вачэй супыніўся на сьцяне клюбу, дзе дрыжэў ад ветру лёзунг: **«Капіталістыя рыхтуюцца задушыць нас ваенным нападам. Працоўная моладзь павінна ўмець аараняць краіну Саветаў».**

...На пляцы комсамольскі вайсковы гурток пад каманду „аць!.. два!.. левы!.. левы!..“ выстукваў нагамі чоткія такты.

Глядзеў на іх Мікіта з радасьцю, забыўся пра ўсе заклікі папоўскія, і злаваў на сваю старасьць... на тое, што ён ужо зараз ня можа нараўне з комсамольцамі абучацца перамагаць імпэрыялістых.

З. Гар.

„Матка божая так вялела“.

Аб цудах і фокусах.


Каб лепш прыцягнуць народ да веры ў бога, папы выдумваюць усялякія цуды і фокусы.

Асабліва гэтая манера ўнушэньня сялянству вераваньня ў бога распаўсюджана на вёсках. Вось цуда, якое здарылася ў вёсцы Галічанцы, Магілеўскай акругі, Падольскай губэрні.

28-га жніўня 1923 году пастух Якаў Мысік упоўдзень адпачываў ў калодзежа са сваім стадкам. Да калодзежа падышла мясцовая сялянка Юзэфа Адамчук. Напіўшыся вады, яна сказала пастуху: **„варта-б тут паставіць вялікі крыж, каб лепш бачыць калодзеж“.**

Увечары пастух прышоў да старшыні царкоўнага савету вёскі Галычанцы і сказаў, што спаткаў каля калодзежа «красную» жанчыну, якая прасіла паставіць каля калодзежа крыж. Аб гэтым пусьцілі чуткі па ўсёй вёсцы, па ўсёй акрузе.

Але з другіх вёсак на гэтыя казкі ніхто не адгукнуўся. Тады царкоўны савет вёскі Галычанцы паслаў пастуха М ы с і к а а г і т а в а ц ь, ён хадзіў па вёсках і гаварыў, што **да яго зьявілася божая матка і прасіла паставіць каля калодзежа крыж.**



Вырасла 7.000 крыжоў.

Агітацыя зрабіла сваю справу. Са ўсёй Падоліі ішлі сяляне з крыжамі і падарункамі. На невялічкім пляцы ў 3 дзесяціны неўзабаве вырасла 7 тысяч крыжоў.

А пастух Мысік, які ўсё гэта выдумаў, сядзеў каля калодзежа, яму насілі дары, цалавалі рукі. Папы па чарзе служылі каля калодзежа малебны, **тут-жа гандлявалі сьвечкамі, ладанам, абразамі. З розных вёсак прыходзілі хворыя шукаць сцаленьня, разносілі заразу, перадавалі франны здаровым.**

Цуда за паўтара мільёна рублёў.

На ўсё гэта сяляне страцілі **паўтара мільёна рублёў**. Урэшце, уся кампанія з пастухом Мысікам была выкрыта і справа перададзена ў суд.

І наогул за апошнія гады вельмі многа цудаў здараецца. Няма амаль ніводнага павету па Савецкім Саюзу, дзе-б не абнаўляліся абразы. Справа робіцца проста; **кладуцца спаць, а раніцой—о, цуда! Абразы абнавіліся.** Але заўсёды пасьля дазнаньня высьвятляецца, што гэта зроблена «рукамі». Як?



Папы спраўлялі малебны.

Спосабаў многа: **ахварбоўка, падчыстка і інш.** А чуткі аб абноўленых хутка распаўсюджваюцца. Пачынаецца як са ўсякімі цудамі, казкі аб сцаленьнях, наладжваюцца малебны, а пры **спрыяючым выпадку ворагі Савецкай улады скарыстоўваюць вялікі наплыў народу для контр-рэволюцыйнай агітацыі.**

Каму цуды патрэбны.

Да чаго ўсё гэта зводзіцца, навошта такія штукі рабіць, на што людзей абманваць?

Цуда Ісафатавай Даліны (так назвалі тую даліну ў вёсцы Галычанцы, дзе паставілі 7 тысяч крыжоў) адбывалася пры такіх умовах. У вёсцы Галычанцы ішла барацьба з-за 90 дзесяцін зямлі. Барацьба вялася паміж кулакамі і беднатой. Пасьля доўгіх спрэчак, гэтыя 90 дзесяцін Савецкая ўлада перадала беднаце.

Тады кулакі пайшлі на другую хітрасьць: парашылі **скарыстаць цемнату беднякоў.**

— **„Чаго нам сварыцца і спрачацца, навошта падзяляцца на кулакоў і беднату, забудзем разлад, усяроўна надыходзіць канец сьвету“**.—казалі кулакі.

Для таго, каб адцягнуць беднату ад барацьбы за зямлю, кулакі разам з папамі пусьцілі чуткі аб цудзе каля калодзежу. Яны хацелі абдурыць беднату цудамі і самім заграбастаць зямлю.

На кароткі час гэта кулаком удалося. Але потым сяляне ўбачылі, што ім галаву марочаць і папрасілі належныя органы аб перадачы справы ў суд.

М. Шэйман.

Выганім бога з быту!

Хто ў каго пакраў багоў?

Рэлігійная абраднасьць ахапіла ўсе бакі чалавечага існаваньня. На працягу тысяч гадоў, пры актыўным падтрымваньнь пануючых клясаў, было дасягнута гэта глыбокае правікненьне рэлігійнасьці ў народныя масы. Рэлігійнасьць зводзіцца да выконваньня нязьлічымай колькасьці абрадаў, мэханічных, несьвядома выконваемых дзеяў. Вырасшыя з гаспадарчых умоў існаваньня людзей многа тысяч гадоў таму назад рэлігійныя сьвяты, звычаі, абрады, узаконены рэлігіяй. «Паганскіх» багоў царква абвясьціла сваімі, перамяніўшы толькі шыльду,—«паганскія» сьвяты яна зрабіла сваімі сьвятамі, «паганскія» абрады—сваімі абрадамі.

Калі моляцца.

Кастрычнікавая рэволюцыя моцна падарвала ўплыў рэлігіі, падарваўшы раней за ўсё экономічную магутнасьць рэлігійных організацый. Рэлігія выгнана з грамадзкага жыцьця, з школ, з грамадзкіх устаноў. Але цяжэй выгнаць рэлігію з быту, з штодзеннага жыцьця. У б це рэлігія трымаецца на абраднасьці, на забабонах, галоўнае, на **экономічнай незабясьпечанасьці сотак мільёнаў людзей,** дзякуючы чаму зьяўляецца ня толькі няўпэўненасьць ў заўтрашнім дні, але **і адпачынак, увесяленьні ня бываюць паміма царкоўнага сьвята, паміма царкоўнага клюбу, паміма царкоўнага тэатру.**

Паляпшэньне ўмоў існаваньня працоўных, якія магчымы толькі пасьля Кастрычніка, **увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, культурнае будаўніцтва, запаўняе быт новым зьместам і канчаткова выціскае рэлігійнасьць з быту.** Рэволюцыя дала вялізарны штуршок у гэтым напрамку. Звыш двух мільёнаў піонэраў—гэта вялікі кавалак новага быту. Два мільёны комсамольцаў, профсаюзы, культурныя організацыі, шэфскія таварыствы, якія працуюць пад кіраўніцтвам компартыі, зьяўляюцца надзейнымі падрыўнікамі рэлігійнага быту.

„Зараз новыя правы“.

Вялізарны зрух, зроблены рэволюцыяй, знайшоў свой адбітак у народнай творчасьці, у песьнях, у прыпеўках.

„Зараз новыя правы,
Ня трэба вянчацца.
У сельсавеце за сталом
Толькі расьпісацца“.

Барацьба за новы быт ёсьць штодзенная барацьба з абраднасьцю, з укараніўшыміся і ўвайшоўшымі ў прывычку рознымі цэрамоніямі, дзеямі. Барацьба за выціскаваньне рэлігійных сьвятаў з быту азначае ўважлівую падрыхтоўку і разумнае правядзеньне рэволюцыйных сьвятаў.

Грунтоўнае ўпрыгожаньне памяшканьня да рэволюцыйнага сьвята, абноўка вопраткі дзяцей, разумныя забавы ў сьвята рэволюцыі—такімі шляхамі рэлігійная абраднасьць будзе паступова выганяцца, зьнікаць з быту. Супроць п'янства ў рэволюцыйныя сьвяты, супроць хуліганства!

Барацьба за новы быт—ёсьць

барацьба за лепшыя ўмовы існаваньня

для соцен мільёнаў людзей, за раўнамернае чаргаваньне працы з адпачынкам, за карыснае скарыстаньне часу, за чыстату ў памяшканьні, чыстату мовы, за вызваленьне жанчын, за ўсеагульную грамату. Усё гэта немагчыма ва ўмовах капіталістычнай грамады, дзе мільёны людзей эксплёатуюцца фабрыкай, зн ходзяцца ў пагрозе беспрацоўя, дзе яны вымушаны быць няпісьменнымі, і дзе адзіным благам для іх зьяўляецца гарэлка і царква.

За 10 год пролетарскай дыктатуры ў Расіі, рэлігіі. якія існавалі тысячы гадоў, пачынаюць здавацца. Вызваленыя ад капіталістычнага рабства рабочыя і сяляне пачынаюць вызваляцца і ад улады рэлігіі.

Ш. М.

5-гадовы плян разьвіцьця гаспадаркі

Даклад тав. А. І. РЫКАВА*).

(На ранішнім пасяджэньні Зьезду УсеКП(б) ад 12 сьнежня).

Адмоўныя зьявы ў галіне таваразвароту краіны.

Спыніўшыся з пачатку дакладу на характарыстыцы сучаснай гаспадарчай кан'юнктуры тав. Рыкаў паказвае, што адзначальнаю рысай яе зьяўляецца и яўнасьць раду адмоўных ненормальных зьявішч у галіне разьвіцьця ўнутранога таваразвароту краіны, якія выявіліся ў апошнім квартале мінулага гаспадарчага году і адчуваюцца па сёнешні дзень.

Адмоўныя вынікі такога разыходжаньня попыту і прапановы можна ўхіліць толькі пры наяўнасьці выстарчальных таварных разэрваў. Мы думалі падыйсьці да рэалізацыі ўраджаю гэтага году значна больш узброенымі ў гэтых адносінах, чым гэта было раней і прыступілі да стварэньня рэзэрваў, пачынаючы з мінулай вясны. Але ўсе тыя рэзэрвы, якія мы пачалі накапляць, якія патрэбны былі для пасьпяховай рэалізацыі ўраджаю, прышлося ў значнай частцы выдаткаваць раней разгарненьня с.-г. кампаніі, у сувязі з выбухам попыту, які быў выкліканы ўскладненьнямі міжнароднага характару.

Такім чынам, сялянства, дзякуючы ўзмоцненай рэалізацыі нехлебных культур і пабочных промыслаў, у гэтым годзе мела многа больш значныя прыбыткі, чым у мінулым.

Ход хлебазагатовак.

Але маецца прыватны крызіс, які лёкалізуецца ў галіне хлебных загатовак.

Напружанае становішча з хлебазагатоўкамі можа і павінна быць выпраўлена, бо па-першае, сялянства ўжо выдаткавала досыць значную частку сродкаў, якую яно атрымала ад пабочных промыслаў і ад рэалізацыі тэхнічных культур, і, па-другое, мы ўжылі меры да павялічэньня прапановы тавараў у весцы, шляхам пашырэньня вытворчасьці баваўняных, шэрсьцяных тканін і раду іншых тавараў.

Побач з гэтым партыя павінна бліжэй прыглядзецца да работы нашых хлебазагатоўчых організацый.

Дзе ўзяць сродкі на індустрыялізацыю.

Паказальнікам таго, што мы ня маем што-небудзь падобнае на агульна-гаспадарчы крызіс, зьяўляецца няўхільнае разьвіцьцё нашай прамысловасьці.

Апрача бягучых затрудненьняў, што зьвязаны з рэалізацыяй ураджаю, мы павінны з усёю яснасьцю бачыць і тыя труднасьці, перамагаць якія нам прыдзецца на працягу доўгага тэрміну, напэўна на працягу бліжэйшых аднаго—двух год. Сюды трэба аднесьці труднасьці, якія вынікаюць: па-першае з неабходнасьці павялічэньня затрат на індустрыялізацыю краіны, без атрыманьня ад іх за гэты-ж час непасрэднага эфэкту ў выглядзе адпаведнага пашырэньня таварнае прапановы.

У прыбытковым бюджэце бягучага году буйнае месца займаюць прыбыткі ад рэалізацыі пазык, дасягаючы, прыблізна, 500 млн. рублёў. Тое, што ў гэтай галіне можна і павінна зрабіць многае, паказвае вопыт пазыкі індустрыялізацыі.

Абапіраючыся на посьпех дзяржаўных пазык у гарадох, мы павінны папрабаваць на працягу гэтага году разьмясьціць пазыку сярод сялянства ў разьмеры ад 50 да 100 млн. рублёў. Трэба толькі здолець надаць гэтай пазыцы такую форму, якая зрабіла-б яе блізкаю, зразумелаю і прывабнаю для шырокіх сялянскіх колаў.

Агульная ацэнка кон'юнктуры зводзіцца да таго, што мы ня маем ні агульнага крызісу таваразвароту між горадам і вёскаю, ні тым больш, агульнага гаспадарчага крызісу.

У галіне замежнага гандлю неабходна забясьпечыць намечаныя разьмеры экспорту хлеба і, у выпадку калі гэта ня ўдасца, трэба выканаць экспортны плян праз фарсіраваньне вывазу іншых экспортных тавараў.

5-гадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі.

Далей тав. Рыкаў пераходзіць да пытаньняў складаньня 5-гадовага пляну.

Трэба грунтоўна ўявіць сабе, што рэалізацыя гэтага пляну зьвязана з перамогаю над шмат якімі труднасьцямі і перашкодамі.

Проблема накапленьня і капітальных укладаньняў займае, бясспрэчна, адно з галоўных месц у пяцігадовым пляне. Зусім бяссэнсным зьяўляецца такі падыход да крытыкі любога варыянту 5-гадовага пляну, які выходзіць з неабходнасьці максымальнага тэмпу разьвіцьця народнае гаспадаркі аднача́сна па ўсіх напрамках.

У кожны даны момант у распараджэньні дзяржавы знаходзіцца абмежаваная колькасьць сродкаў. Вырашэньне пытаньня аб найбольш шпаркім соцыялістычным будаўніцтве заключаецца ня ў тым, каб усіх задаволіць у максымальным разьмеры (гэтага зрабіць ніхто ня можа), але ў такім разьмеркаваньні сродкаў, якое дало-б найбольшы вынік на будаўніцтва новага грамадзтва.

Індустрыялізацыя ўсяе краіны, не гаворачы ўжо спэцыяльна аб абароне, упіраецца ў бягучы час у разьвіцьцё цяжкае індустрыі. Ад разьвіцьця цяжкое індустрыі, у асобку, машынабудаўніцтва, залежыць разьвіцьцё і лёгкае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Пытаньні беспрацоўя і аграрнае перанаселенасьці.

У зьвязку з пераходам у бліжэйшы год на 7-гадзінны рабочы дзень, колькасьць занятых ў прамысловасьці рабочых павінна значна ўзрасьці. Але і пры гэтай умове на працягу 5-ці год наўрад ці ўдасца цалком вырашыць проблему беспрацоўя і аграрнае перанаселенасьці.

Гаспадарчая рэволюцыя немагчыма бяз культурнай.

У найшчыльнейшай сувязі з гэтым стаяць пытаньні культуры. У нас культурнае разьвіцьцё значна адстае ад нашага гаспадарчага разьвіцьця і падвышэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочых і сялян. Ажыцьцяўленьне індустрыялізацыі і ўздым гаспадаркі ў далейшым ня можа адбывацца без паралельнага ўздыму культурнага ўзроўню краіны.

5-гадовы плян павінен забясьпечыць поўнае скарыстаньне гэтых гіганцкіх мас, актыўных удзельнікаў соцыялістычнага будаўніцтва; для поўнае перамогі рабочае клясы ў барацьбе за пабудову новага грамадзтва. (Бурныя, доўгія воплескі; дэлегаты стоячы вітаюць тав. Рыкава).

*) Даклад зьмяшчаецца ў скарочаным відзе.

Як хто адзначыў Кастрычнік

Конкурс газэты „Чырвоная Зьмена“ і кастрычнікавай камісіі на лепшае правядзеньне першага дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі вясковымі ячэйкамі.

Да сьвітаньня...

№ 27. Шэйская ячэйка ЛКСМБ, Крупскі раён, Аршаншчына.

Прыблізна за месяц да сьвяткаваньня Кастрычніка, бюро нашай комсамольскай ячэйкі падрабязгова абгаварыла пытаньне аб удзеле ў конкурсе „Чырвонай Зьмены“ і цэнтральнай кастрычнікавай камісіі і паршыла—**згуртавацца з культурнымі сіламі вёскі, з беспартыйнай вясковай моладзьдзю, з сельсавэтчыкамі і іншымі грамадзкімі працаўнікамі, і колектыўна рыхтавацца да вялікага дзесяцігодзьдзя.**

Камісія па правядзеньню Кастрычніка ў вёсцы Худаўцы з посьпехам справілася са сваімі задачамі.

Былі ўпрыгожаны комсамольскі клюб, хата-чытальня. **Хаты комсамольцаў вылучаліся з суседніх зеленьню, чырвонымі сьцягамі, портрэтамі правадыроў, лёзунгамі.**

7-га лістапада ў мясцовай вясковай школе адбыўся шырокі сялянскі вечар з урачыстым паседжаньнем.

Пасьля ўрачыстай часткі, комсамольцы сумесна з беспартыйнай моладзьдзю паставілі п'есу А. Глебава **«Расплата»**.

Пасьля спэктаклю была зачытана насьценная газэта «Чырвоная Зорка», прысьвечаная да Кастрычніковай рэволюцыі. Апрача артыкулаў і допісаў агульнага характару аб дасягненьнях нашай вёскі сьвяточнага матар'ялу, у ёй у кутку **«Смех і Гора»** «крыліся» ўсе недахопы вёскі, «фанабэрствы» прадстаўнікоў мясцовай улады, валакіты ў судовых справах і інш.

Працягам чыткі насьценнай газэты былі дэклямацыі комсамольцаў і вучняў вясковай школы. Бацькі былі вельмі здаволены, што іх дзеці так сьмела і ўмела выступаюць перад такім натоўпам людзей.

На гэты вечар, апрача сялян і моладзі вёскі Худаўцоў, былі запрошаны госьці з суседніх вёсак.

Як пачало сьвітаць, здаволеныя з добрым настроем аб вечары і сьвяце разышліся па сваіх хатах сяляне і моладзь.

Сяргей Патапенка.



Запалілася электрыка.

№ 28. Лошыцкая ячэйка ЛКСМБ, Самахвалавіцкі раён.

10-цігодзьдзе Кастрычнікавай рэволюцыі мы сьвяткавалі разам з днём ураджаю. Да гэтых сьвят наша комсамольская ячэйка адрамантавала клюб, выпусьціла пашыраны нумар насьценнай газэты. А галоўнае, на 7-е лістапада **было прысьвечана ўрачыстае адчыненьне сельска-гаспадарчай выстаўкі і электрычнай станцыі ў нашай вёсцы.**

Урачыстая частка, на якой прысутнічалі як мясцовыя, так і раённыя працаўнікі, прайшла вельмі жыва. Асабліва радавала ўсіх адчыненьне электрычнасьці.

— **«Таварышы, мы лямпачкай Ільліча, асьвецім нашу вёску, мы гэтым выконваем заветы Леніна»**—кажа загадчык.

Потым усе прысутныя на ўрачыстай частцы пайшлі на сельска-гаспадарчую выстаўку. Памяшканьне ўпрыгожана зеленьню, уверсе над дзьвярыма ўпяршыню ў нашай вёсцы сьвеціцца электрычны ліхтар. А ў сярэдзіне памяшканьня—розныя экспонаты мясцовага савхозу, суседніх вёсак.

Асабліва вылучаюцца экспонаты комсамольца—самастойнага гаспадара **Янкі Хвалькоўскага** з вёскі **Карзюкі**, Навадворскага сельсавету. Гэта караньплоды вагой у 9 фунтаў і гарбузы ў паўтары пуды кожны. Яшчэ добрыя былі экспонаты комсамольца **Міколы Шэшкі**. Гэтыя комсамольцы атрымалі прэміі—цэлы набор добрай літаратуры па сельскай гаспадарцы.

Пасьля выстаўкі пашлі ў клюб, дзе адбыўся спэктакль, гульні, скокі. З радасьцю і вясёлым настроем разыходзіліся па хатах.

Ружовы.

„Зялёнае“ і „сіняе“.

№ 29. Старобінская ячэйка ЛКСМБ, Бабруйская акруга.

Падрыхтоўка пачалася ў нас задоўга да сьвята. Галоўная ўвага ва ўсёй падрыхтоўчай працы была зьвернута на большае ўцягненьне ўва ўсе мерапрыемствы па адзнацы сьвята як мага больш беспартыйнай сялянскай моладзі.

Для гэтага перад сьвятам наша ячэйка правяла масавы сход сялянскай моладзі, на якім быў пастаўлен даклад **«Кастрычнік і ўдзел у ім моладзі»**. На сходзе прысутнічала каля сотні чалавек.

Плян сьвяткаваньня ў нас быў разьмяркован у наступным парадку: 6-га ўвечары ўрачыстае пасяджэньне, 7-га—шырокая дэмонстрацыя, мітынг, 8-га—піонэрскі дзень. **Да гэтага дню сіламі піонэрскай організацыі і комсамольцаў была падрыхтавана масавая ваенная гульня—піонэрскія манэўры.**

Перад сьвятам увечары ўсе вуліцы і пляц, ня гледзячы на гразкае надвор'е, былі запоўнены дэмонстрантамі.

Цікавей за ўсё прайшлі

піонэрскія манэўры

Да іх рыхтаваліся тыдні тры. Для кіраўніцтва манэўрамі былі запрошаны два партыйцы, добрыя ваенныя спэцы. Разьдзяліліся на дзьве арміі—не на «белых» і «чырвоных», а на «зялёных» і «сініх».

Яшчэ цемнавата. Холадна. 5 гадзін раніцы. Раптам раздаецца залп з вінтовак. Гэта сыгнал аб пачатку манэўраў.

Усё, як на самай «вайне». У большых піонэраў і комсамольцаў за плячыма вінтоўкі. Разьведка і шпікі працуюць ва ўсю. Праз 4 гадзіны—бойка скончана.

Юр. Бялько.



Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Шалёная кампанія супроць комуністычнае партыі і комсамолу ў Паўднёва-Славіі.—Пілсудзкі не пакідае намеру захапіць Літву.—Абвінавачваньні СССР ў кантонскім пераваротце.—Контр-рэволюцыя ізноў авалодала Кантонам.

Арышты рэволюцыянэраў у Паўднёва-Славіі

Рост уплыву комуністычнае партыі і комсамолу Паўднёваславіі на працоўныя масы.

Іх узросшая дзейнасьць. Іх бязупынная праца па рэволюцыянізаваньню насельніцтва прыводзіць буржуазію да вар'яцтва.

Ня гледзячы на разгром нелегальных друкарань, ня гледзячы на сыстэматычнае прасьледваньне з боку паліцыі, комсамол усё-ж такі наладжвае выданьне сваёй газэты пад назвай «Малады Бальшавік».

Усе гэтыя факты непакояць буржуазію.

Яна распачала шалёную кампанію супроць комуністычнае партыі і комсамолу.

У апошнія месяцы ў Паўднёва-Славіі сярод рабочых і асабліва сярод рабочай моладзі былі праведзены масавыя арышты.

У адным Белградзе (сталіца Паўднёва-Славіі) арыштавана на працягу апошніх двух тыдняў больш 60 чалавек.

Усе арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да компартыі і комсамолу.

Усіх арыштаваных зараз-жа накіроўваюць у турму, вядомую сваімі зьверствамі.

Умовы ў турме наводзяць жах на чалавека, які туды пападае.

У невялічкіх пакойчыках знаходзяцца па 40-50 чалавек.

Нават, сесьці ўсім на падлове, немагчыма з-за цеснаты.

У адносінах да комуністых у гэтай турме існуе асобны «рэжым».

Допыт праводзіцца звычайна між 12 і 2 гадзінамі ўначы.

Арыштаваных пры гэткіх «допытах» кідаюць у пакой, дзе знаходзяцца паліцыянты з гумовымі кіямі.

Спачатку, ў гэткіх абставінах, прапануюць арыштаванаму падрабязна паведаміць аб сваёй працы і аб працы арыштаваных таварышоў.

Пасьля таго, як арыштаваны адмовіцца, пускаюць у рух розныя турэмныя прылады.

На арыштаванага сыплюцца з усіх бакоў удары.

Потым сьцягваюць боты, абгортваюць галаву гумовым пакрывалам, каб ня было чуваць крыкаў і пачынаюць біць у пяты.

У пяты б'юць таму, што гэта выклікае страшэнную боль і не пакідае вялікіх адзнакаў.

Пад раніцу арыштаванага накіроўваюць у пакой, дзе ён «адпачывае», покуль не зажывуць раны.

Такога парадку «допыты» паўтараюцца некалькі разоў у тыдзень.

Больш усяго дастаецца маладым рэволюцыянэрам.

Самых вядомых дзеячоў рабочага руху прысуджаюць да доўгатэрміновай катаргі.

У апошнія часы паліцыя больш усяго дапытвалася аб складзе ЦК комсамолу і політбюро партыі.

Супроць белага тэрору на Балканах.

КІМ выдаў адозву да рабочай моладзі ўсяго сьвету.

— Кожны дзень,—гаворыцца ў адозьве, паступаюць новыя весткі аб зьверствах у паўднёваслаўскіх турмах.

За падрыхтоўку дэлегацыі ў СССР за падрыхтоўку да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя пролетарскае рэволюцыі ў Белградзе і іншых гарадох звыш 60 чалавек рабочае моладзі пасаджаны ў турмы падпадаюць зьверству турэмнага рэжыму.

Жыцьцё шмат якіх паўднёваслаўскіх рабочых знаходзіцца ў небясьпецы.

Рабочая моладзь усяго сьвету! Комуністычная моладзь усіх краін!

Організуйце дэмонстрацыі салідарнасьці. Наладжвайце масавыя сходы з запатрабаваньнем вызваленьня ахвяр крывавага тэрору.

Літва застаецца пад пагрозай

Польска-літоўскі конфлікт вырашан Лігай Нацый толькі формальна.

Апошняя пастанова Лігі, ні кроплі не супярэчыць Пілсудзкаму праводзіць свае пляны.

У Віленскай акрузе знаходзіцца дастаткова цёмных сіл, якія могуць утварыць розныя махінацыі па загаду Пілсудскага.



Нічога няма цяжкага ў тым, каб усе гэтыя сілы надзелі літоўскія мундзіры, перайшлі літоўскую мяжу і адтуль «напалі» на панскую Польшчу.

Тады Пілсудзкі можа «на законных падставах» павесьці свае войска ў Літву на дапамогу цёмным сілам з белагвардзейцаў і рэакцыянэраў,

Гэта ня будзе разыходзіцца, нават, з пастановаю Лігій Нацый.

Хіба-ж вінават Пілсудзкі, калі на яго напалі літоўцы!

У адозьве компартый Польшчы, Літвы, Латвіі, Нямеччыны, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны гаворыцца:

«Пагроза вайны навісла над літоўскім народам.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага хоча правесьці даўно задуманы плян захопу Літвы.

Аб гэтым сьведчыць падрыхтоўка польскай арміі каля літоўскай мяжы».

Як бачыце, пагроза вайны ня можа быць зьнішчана пастановамі Лігі Нацый.

Працоўныя СССР і ўсяго сьвету параней ўшаму павінны быць насторожанымі.

Здраднікі кітайскай рэволюцыі за разрыў з СССР.

У сваёй гутарцы вядомы здраднік Кітайскай рэволюцыі Чан-Кай-шы заявіў, што па яго думцы рэволюцыйнае паўстаньне ў Кантоне організована савецкім прадстаўніцтвам.

«Але кантонскі пераварот,—сказаў ён,—не зьяўляецца здарэньнем мясцовага значэньня. Гэткія-ж здарэньні могуць адбыцца і ў Пекіне, і ў Шанхаі, і ў Ханькоу.

Кантон—толькі пачатак».

Далей Чан-Кай-шы заявіў, што для папярэджаньня новых рэволюцыйных паўстаньняў неабходна парваць адносіны з СССР і выселіць ўсіх савецкіх прадстаўнікоў.

„Неабходна—сказаў ён,—ня толькі парваць з СССР, але і аб'яднацца з іншымі дзяржавамі для барацьбы супроць кітайскіх комуністых“.

Кантон ізноў у руках контр-рэволюцыі.

Усе мы радаваліся буйнай перамозе кітайскіх рабочых і сялян.

Усе мы былі надзвычайна здаволены ўстанаўленьнем савецкай улады ў Кантоне.

Але з вялікім жалем прыходзіцца сустракаць тэлеграмы аб тым, што комуністыя ў цяжкіх крывавых бойках выбіты з Кантону і адступілі.

Але адзін факт заняцьця Кантону рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі, аб'вяшчэньне там **савецкага** ўраду гаворыць аб энэргіі і клясавай самасьвядомасьці кітайскіх працоўных.

Мільёны сялянства і ўвесь кітайскі пролетарыят прышлі ў рух.

Сотні тысяч сялян і рабочых узяліся за зброю.

„У сучасны момант,—кажа тав. **Бухарын** на 15 зьезьдзе партыі,—мы ўступаем не ў паласу ўміратварэньня, а ў паласу разгортваньня **калёніяльнае** барацьбы, таму што вялікая кітайская рэволюцыя не памерла, а жыве і разьвіваецца“...

„...Буржуазія даўно перашла ўжо ў лягер контр-рэволюцыі; зараз суадносіны клясавых сіл зусім іншае зараз гутарка можа ісьці толькі аб барацьбе рабочае клясы, сялянства і часткі дробнай гарадзкой буржуазіі супроць сіл замежнага імпэрыялізму, фэодалаў і супроць нацыянальнай буржуазіі“.

«Кітайская рэволюцыя,—кажа далей тав. Бухарын,—**ня толькі не памерла, але, мне здаецца, што мы стаім перад новай вялікай рэволюцыйнай хваляй у Кітаі, перад новым выступленьнем рабочае клясы і сялянства».**

Гэтыя словы сказаны тав. Бухарыным тады, калі яшчэ ня было вядома аб выступленьні рэволюцыйнага пролетарыяту ў Кантоне.

Але правільная ўстаноўка т. Бухарына сьцьвярджаецца фактамі.

Нявер'е опозіцыі ў сілы рабочае клясы, чорны настрой у адносінах перспэктыў сусьветнае рэволюцыі—**разьбіваецца аб новую магутную хвалю кітайскай рэволюцыі.**

Падзеі ў Кантоне нанесьлі новы страшэнны ўдар па опозіцыі.

Алёнін.

Папіросы „Наша марка“ і брудная бялізна.

Малое ў вялікім.

Ці ведае ячэйка, як організоўваюць свой быт комсамольцы, як яны адносяцца да сваёй сям'і, колектыву? Пераважная большасьць ячэек гэтымі пытаньнямі не займаецца.

— Комсамолец бескарысна траціць свой час, курыць папяросы абаянкова «першага сорту», ня маючы зьмены бялізны, за «фасоннай» адзежай комсамолкі—выглядаюць хамскія адносіны да хворай маткі.— Гэта «дробныя» пытаньні—па думцы шмат якіх ячэек. Дык хіба ёсьць у іх час наогул займацца «бялізнай», «Нашымі маркамі» і г.д., калі на абвестцы дню пытаньне аб будаўніцтве социялізлу?

Але такія погляды ў корані нявершыя.

Бяз культурнай організацыі быту мы не пабудуем социялізму. У цяперашні час рэволюцыйных будняў кожная такая «дробязь» мае вялізарнейшае значэньне.

Мы правяраем комуністычную вытрымана́сьць моладзі ў малым для таго, каб яна была верна ў вялікім.

Многія лепшыя комсамольцы, умела організуючыя ячэйкавую працу, становяцца «ў тупік», калі прабуюць свой уласны быт організоўваць так, каб асабістае жыцьцё было ўвязана з грамадзкім.

Яны ня ўмеюць організоўваць сябе, ня ўмеюць, як за гэтую справу ўзяцца.

У гэтым павінна дапамагчы ім ячэйка, але ня толькі выклікам на бюро, шляхам індывідуальных справаздач, што практыкуецца ўва многіх ячэйках. Гэты мэтад казённы і не дасягае мэты.

Чаму-б не прарабіць такі, прыкладна вопыт. Вызначыўшы, што даная група комсамольцаў ня ўмее правільна расходваць свой заробак, ячэйка дагаварваецца з імі аб тым, што ў працягу 2-3 месяцаў яны будуць дапамагаць ім у разьмеркаваньні свайго бюджэту і, бязумоўна, такі таварыскі кантроль дапаможа справе куды лепш якога-небудзь «дакладу аб быце».

Чаму-б комсамольскай ячэйцы, юнсэкцыі не паставіць гэтыя пытаньні потым на сходзе ячэйкі, не пачытаць аб тым, як умеў жыць Ленін.

А Ленін умеў жыць кожнай хвілінай. Ленін быў адзіны—калі імчаўся па балотных купінках са стрэльбай за дзіччу і ловячы рэнегата Каутскага па купінках яго здрадніцтва. Павучыцца ў Леніна як адпачываць, як організоўваць свой час—вельмі карысна для нашых комсамольцаў.

Нам трэба вучыцца і вельмі многа вучыцца.

Хай кожны комсамолец, пачынаючы спачатку з дробязі, праверыць на іх сваю комуністычную вытрыманасьць, каб потым быць верным у вялікім.

Што сказала адна анкета.

— Што комсамольцы чытаюць? Як, скольки, дзе? Ці чытае наогул комсамолец кнігу, газэту?—Такія пытаньні паставіла сабе Менская ячэйка ВСНГ. Яна рашыла правесьці сярод комсамольцаў анкету па гэтых пытаньнях.

Праўда, анкета—яшчэ недастатковы мэтад для вывучэньня вызначаных пытаньняў, але ўсё-ж, на першы час, дапамагла знайсьці некаторы шлях да комсамольскага чытаньня.

Чытае моладзь больш бэлетрыстыку: Джэка Лёндана, Гладкова, А. Талстога, Горкага, Тургенева. Політычная кніжка—рэдкі госьць. Ёсьць імкненьні да навуковай, тэхнічнай кніжкі.

Па пункту анкеты: **«Якое пытаньне цябе цікавіць зараз у кніжцы?“**—адказы самыя розвастойныя. Адных цікавіць: «будаўніцтва соцыялізму», «сучасны быт», «гісторыя чалавецтва і наогул жывёлы», «сучасная тэхніка». Другі хоча «вырашыць пытаньне, хто пераможа ў будучай вайне“. Адзін нават адказаў «цікавіць кінематографічна“. І далей, у водгуку аб кніжцы, заявіў: люблю чытаць кніжкі, якія «дейнічаюць воінственна», як на прыклад «Нат Пінкертон».

«Дзе ты здабываеш кнігі?»—На гэтае пытаньне 3 адказалі «у клюбнай бібліотэцы», 9—«у таварыша“. Ніводзін комсамолец ня купляе кніжак. Агульнае правіла—чытаюць па хатах.

Цікава адзначыць момант, скольки гадзін у дзень чытае комсамолец. Тут—агульны адказ: «нявызначаны час», «чытаю па 2-3 гадзіны ў дзень, калі і зусім ня чытаю», «рэгулярна чытаю толькі газэты»—піша адзін актывісты. А другі актывісты, дык зусім «у хвіліну сумную» чытае.

Якая тут прычына? У многіх «нагрузка», многія зусім не паказваюць прычын, спасылаюцца на «няма часу».

Вядома наша, часам, абломаўская пастаноўка працы (5-цігадзінныя, шматлікія пасяджэньні «пераліваньне з пустога ў парожняе» на сходах) спрыяе таму, што ня знойдзеш часу для свайго разьвіцьця. Праўда, узімку вучоба ў парт'палітшколах і г. д. Але нельга не сказаць аб нашым «зле»,—«няўменьні разьмяркоўваць свой дзень, свой час».

Аб гэтым гаворыць нам анкета. А ў жыцьці—павядзем барацьбу з гэтым злом. Хай першымі будуць «ВСНГ'акаўскія» комсамольцы.

Мі—ч.

Комуна чатырох

Сямён Варонін і Якаў Клубняў організавалі комуну. На два пакоі ў розных раёнах хлапцы зьмянілі два сумежныя пакоі. Хутка абодва пазнаёміўшыся з добрымі дзяўчатамі—жаніліся. Цяпер гэта чацьвёрка ўяўляе з сябе надзвычайна добрую комуну. Зарплата паступае ў агульную касу.

Прыкладна жыве гэта маленькая комуна. Жонка Вароніна вучыцца на рабфаку, а Клубнева працуе белшвэйкай дома. Варонін—на чале комуны.

„Усе за аднаго і адзін за ўсіх“—вось лёзунг комуны.

У тэатр, у кіно—усе ідуць разам, у чатырох. Суседзі нават дзівяцца, гледзячы на жыцьцё шчасьлівай чацьвёркі.

У хуткай будучыне чакаецца зьяўленьне яшчэ новага сябра сям'і. Далейшае павялічэньне сям'і ня пужае комуну.

Касімаў.



Кватэра адна—гаспадары розныя.

Абодва комсамольцы.

У аднаго па бюджэту—бутэлька піва, ў другога—добрая кніжка.

(Завод «Васход», Менск).

Дрэнна траціць свае грошы большасьць комсамольцаў. Я ведаю аднаго хлапца са скуранога заводу. Ён зарабляе 45 рублёў. Акрамя скуранай курткі і верхняй вопраткі—больш амаль нічога ня мае. Боты ў яго адны. У іх і на працы, і ў клюбе. А якія боты! Брудныя, «лата на лаце сядзіць і латай паганяе».

Бялізны мае дзьве пары, сам аб гэтым кажа.

— Куды грошы траціш?—запытаўся я ідучы з ім разам па вуліцы.

Ён адсунуўшы руку наперад, па пальцах стаў лічыць: папяросы купляю, у кіно зойдзеш іншы раз, у тэатр. Бывае і выпіўку наладзім. Ды і што гаварыць: туды-сюды і няма. Яшчэ трэба пазычаць у таварышоў.

А вось Гольдбэрг з заводу «Васход», Ня гледзячы на тое, што ён зарабляе 28 рублёў, за кароткі тэрмін купіў: паліто, касьцюм, боты (дзьве пары: выхадныя і для працы).

Нават хутка кнігі будзе купляць для школы, і для гэтага зьбірае па грошыку. Папяросы першага сорту «Наша марка», выпіўка—у Гольдбэрга на астатнім пляне. У яго бюджэце—рэжым эканоміі. Ён і ў кіно ходзіць, але не за 50 к. у «Чырвоную Зорку», а за 10 у свой клюб КІМ.

М.

„Ці-ж можна з 30 рублёў, ды яшчэ і матцы даваць?“.

(Менск. ячэйка «Чырвоны Хімік»).

Вельмі часта сустракаеш выпадкі, калі комсамолец ці комсамолка ня ладзяць з бацькамі. У большасьці гэта адбываецца на падставе «экономічнай».

— Я працую, я грошы атрымліваю—значыць яны (грошы) **мне** патрэбны—так яны гавораць.

У выніку сварацца, кідаюцца талеркамі, б'юцца чапялою і г. д. Калі бацька старога погляду—верыць у бога—ён мне верагл. А таму і абляць яго можна.

Шмат якія комсамольцы па гэтай прычыне жывуць на асобных кватэрах, не прызнаючы бацькоў ні «дэ-юрэ» ні «дэ-факто».

Вось, напрыклад, комсамолка Г. з ячэйкі «Чырвоны Хімік» сварыцца з сваёю маткаю ўжо доўгі час.

Бачыце, «яна комсамолка—дзяўчына маладая, ёй трэба пагуляць». Ёй таксама «трэба апранацца па апошняй модзе» часта хадзіць у кіно, тэатр. А ці-ж можна з 34 рублёў яшчэ і матцы дапамагаць? Матка ў гэтай комсамолкі старая і зусім хворая. І яна заўсёды на свае сьлёзы атрымлівае адказ:

— Зарабляй сама!

У хуткім часе гэта комсамолка стане перад судом комсамольскай ячэйкі. Хай апошняя ёй пакажа, як трэба жыць комсамольцу ў сям'і.

М—о.



Кэдрык, як ты адносішся да сваей жонкі?

(Вёска Жыліхава, Чырвона-Слабадзкі раён)

Кэдрык—курсант АБВШ—хлапец жанаты. І шлюб яго зарэгістраваны ў ЗАГС'е. Яшчэ сакратарствуючы ў комсамольскай ячэйцы, закахаўся дзяўчынкай. Сайшліся.

Дзяўчынка праз некаторы час радзіла сына. Кэдрык быў прымушаны накіраваць яе з дзіцём да бацькоў.

Сучобу працягваў.

Прыяжджаючы дамоў, на вакацыі, Кэдрык да жонкі і не падыходзіць. З бацькамі павітаецца, а яе заўсёды абміне. «Не мая яна жонка, яна мяне ня варта». У сьлязох праводзіць няшчасная маладзіца,—жонка будучага чырвонага камандзіра—дні і ночы. Уся сям'я па навучаньню Кэдрыка зьдзекуецца над ёю.

Паміж іншым Кэдрык, пэўна, там у Менску трымае сябе чэсным, адданым комсамольцам. Сям'я—гэта дробязь—так думае Кэдрык. Па-мойму трэба ўсё-ж комсамольскаму колектыву АБВШ пэвк рэагаваць на такія ўчынкі.

М. Шпілеўскі.



Ня пушчае у ячэйку.

„Флясбах“.

Ня думайце, таварышы, што гэта назва якой-небудзь замежнай газэты, ці яшчэ што-небудзь падобнае. „Флясбах“—гэта проста назва колектыву былых вучняў Бабруйскай сямігодкі, склаўшых яе з „першых літар сваіх прозьвішч.

„Флясбах“—гэта: Фая, Лёва, Яшка, Сёма, Барыс, Айзік і Хаім, якія „організаваліся“ яшчэ ў 1923 годзе. Яны жылі амаль на адным двары, вучыліся ў адной школе і яшчэ іх аб'ядна́ла вельмі важная, агульная для ўсіх семярых хлапцоў уласьцівасьць—надзвычайны збытак энэргіі.

Актыўнасьць, энэргія,—гэтыя ўласьцівасьці надта добрыя, калі яны накіраваны на добры, правільны шлях. Хіба нам не вядома, як часта маладыя людзі нашага комсамольскага ўзросту трацяць сваю энэргію на п'яныя вячоркі, швэнданьне па вуліцах „узад і ўперад“, „нічога нядзеланьне“.

Хіба побач з гэтым мала ў нас такіх фактаў, калі „заядлых хуліганаў“, „гультаёў“ юнсэкцыя, ячэйка, даручаючы ім „працу па душы“ рабіла добрымі адданымі, працаўнікамі.

У бабруйскіх сяброў „Флясбаху“—энэргія спачатку стукалася ў школьныя дзьверы і там прабавала ўжывацца ў маленькіх допісах, малюнках, вершах у насьценгазэце, у клапатлівай, марудлай, але такой радаснай працы,—у рэдкалегіі. Але маленькая, штомесячная школьная газэтка стала „надта цеснай“, каб „поўнасьцю выявіць мастацка-літаратурныя здольнасьці кожнага“ з гэтых хлапцоў. Вока ячэйкі вучкому пэўна ня было ў гэты час.

І яны пачалі выпушчаць спачатку сваю насьценгазэту „Луч Флясбаха“, потым сваю часопісь, потым нават організавалі свой „Флясбахаўскі“ клюб.

Праўда, гэты клюб, пабудаваны з старога хлеву, абкле́ены таннымі абоямі, з шахматным столікам, бібліотэчкай і нават з чырвоным сьцягам на страсе—нельга параўнаць з клюбам школы. Нельга было параўнаць яго з клюбам, напрыклад, саматужнікаў, да якіх прыналежылі бацькі „флясбахаўцаў“, але ўсё-ж, па думцы „флясбахаўцаў“—ён быў „свой“, „прыватны“, „родны“. Яны нават вершы свайму „клюбу“ прысьвячаюць!

Вось тут якраз пайшла «флясбахаўская» энэргія ў той бок, куды-б ня варта-было ёй ісьці.

* * *

Часопісь „Юмарыст“—старанна размалёваная, добра пераплеценая ў жоўтыя, блакітныя вокладкі, вышла ў сьвет у колькасьці 15 нумароў. Не адзін дзесятак начэй праседзелі хлопцы над гэтай клапатлівай „рэдакцыйнай“ працай, дзесяткі гадзін былі страчаны... На што?

Па тэхніцы, асабліва, па фота-здымках, якія па мастацкім выкананьні ня ўступяць і фота-кору друкаванай газэты,—часопісь выглядае даволі прыхожай.

Але па зьместу?

„Сьмяяцца здарава!“—заклікае ў жоўта-чырвоных, зялёна-блакітных фарбах лёзунг «Флясбаха». І пачытаўшы „Юмарыст“, праўда хочацца здорава пасьмяяцца над гэтымі 17-ці, 18-ці, нават 19-цігадовымі „літэратарамі“.


Якія асноўныя задачы гэтай часопісі? «Асьвятляць жыцьцё і быт колектыву „Флясбах“. „Рэдколегія ўпэўнена, што сустрэне шырокі (!) водгук сярод чытачоў!“. (Якіх акрамя рэдколегіі, 4 чалавекі!). Наша асноўная задача, па-першае—пісаць, па-другое—пісаць і па-трэцяе—пісаць“.

Але што-ж яны пішуць?

З нумару ў нумар дэмонструецца, як „у С. З. зьявілася вялікая печ з носу“, і як „вада вышла з берагоў і заліла ўсе яго кашулі»... Што: „у Я. В.—на правай назе вырасьлі мазалі“, а „Х. В. кусаюць клапы“, і што: „у гутарцы са спэцыяльным корэспондэнтам», выявілася, як хтосьці „правёў у носе Б.—электрычную праводку“..., што: „Х. В.—разгарнуў шырокую працу сярод дзяўчат“, і астатнія сябры колектыву „жадаюць пасьледаваць яго прыкладу“..., што „С. Б.—марыць Фэрбэнксам“, „Б. Б.—Барбарай-ля-Мар“, „А. В.—Пат—Паташонам“ і г. д...

Наогул, „насмарк“, „мазалі“, „клапы“ і іншыя па думцы „флясбахаўцаў“—моманты „новага быту“ -фігуруюць на працягу амаль усіх нумароў. Нават перадавыя прысьвечаны гэтай „злапалучнай“ „электрычнай праводцы“, а наконт „мазалей“, дык акрамя абвестак і допісаў, зьмешчаны спэцыяльны „ліст у рэдакцыю“.

У „Юмарысту“, як і ва ўсякай большменш паважнай гумарыстычнай часопісі, ёсьць аддзелы: «запытаньняў і адказаў“, „здарэньняў“, «лістоў у рэдакцыю“, (нават „папраўкі“) літаратурная старонка і перадавыя.



Клюб „Флясбаха“.

Чаму прысьвечаны перадавыя? Скончыў О. В. сямігодку—яму прысьвячаецца перадавая. Выяжджае ў Ленінград вучыцца С. З.—яму ў перадавой „пажаданьні ў будучым“, у чэсьць яго „гістарычныя“ фота-здымкі „сябры Флясбаха ў часе ад'езду С. З. у Ленінград“. І калі С. З. зноў вярнуўся ў Бабруйск (не паступіў), зноў—здымкі „у часе яго прыезду“. Зьмяшчаюцца нават яго „уражаньні“, што „ў Ленінградзе ўсе касіры і кантралёры тэатраў—здадзеі“... і г. д... Ці-ж важна для „флясбахаўцаў“ абывательскага характару гэтыя „уражаньні“, ці не? Ці важна „флясбахаўцам“ і тое, як адносяцца некаторыя з іх да беларускай мовы? Гэта для іх ня важна. Для іх асноўная задача толькі... пісаць. Яны нават конкурс абвясьцілі на лепшы допіс (з преміяй) з заўвагай ад рэдакцыі: „як пісаць“.

Для „аж'ыўленьня“ сваёй часопісі, „флясбахаўцы“ нават ня брэзгуюць і спісваньнем апавяданьняў Аверчанка, Чэхава. Ня важна што іх погляд застанаўліваецца часта на некаторых порнаграфічных момантах—гэта ня важна, толькі-б „пісаць“.

* * *

Наогул гаворачы, калі чытаеш гэтую самую „флясбахаўскую літаратуру“, шкода становіцца энэргіі, часу, фотографічных пласьцінак, здольнасьцяў, якія-б можна было-б скарыстаць з большай карысьцю.

Ёсьць у гэтых хлапцоў шмат добрых імкненьняў. Яны наладжваюць колектыўныя выгадкі на лыжах, купаньні, шахматныя турніры, спортыўныя спаборніцтвы. Яны пішуць нават у сваёй часопісі колектыўны раман з конкурсам на канчатак.

Праўда, зьмест гэтага роману вельмі характэрны для сябраў так-званай „хатняй юнсэкцыі“. Замкнуўшыся ў цеснае кола, бачачы толькі тое, што ў іх робіцца „пад носам“ і „ў носе“, яны ў сваім рамане і рэволюцыю робяць „па-хатняму“. Робіцца яна адным Гэрманам, прыехаўшым з Савецкага Саюзу, павучнёўску лёгка і гарэзьліва.

Дык гэтаму няма чаго і дзівіцца. Ці могуць думкі людзей, у якіх „хатнія інтарасы“—вышэй за ўсё, узьлятаць далей гэтых «хатніх парогаў“? Наогул таварышы з «Флясбаху» думаюць, што іх „колектыў“ штосьці робіць карыснае, дзельнае, яны нават думаюць у будучым „свае дасягненьні і веды прасоўваць у рабочыя масы“.

Ці гэта так?.

На справе, таварышы з гэтага „колектыву“, ці-ж не падобныя вы тым старым, буржуазным гімназістыкам, якія ў свой час, організоўваліся ў розныя «Чорныя маскі», «Каморы», „Зэро“. Якія хадзілі ў масках на могілкі, біліся з другімі „хаўрамі“, кралі ў бацькоў грошы, куцілі і таксама выдавалі ў гімназіях свае часопісі.

Але гэта было раней.

Цяпер, калі наша краіна гудзіць ад мільёнаў удараў молатам, будуе першы ў сьвеце вучастак соцыялізму, калі кожны сьвядомы грамадзянін Савецкай краіны, ахоплены энтузыязмам будаўніцтва, будуе гэты соцыялізм у сваёй будзічнай працы,—сорамна замыкацца ў сваёй „уласнай шкарлупцы“, сорамна калупацца ў сваім „уласным носе“...

Ідзеце, дарагія таварышы «Флясбахаўцы» ў нашы юнсэкцыі, клюбы моладзі, там праявеце сваю актыўнасьць, туды аддайце свае мастацка-літаратурныя здольнасьці на грамадзкую справу, у агульны кацёл.

А. Сучкова.

1918—1927.

Комсамольскае сьвята ў Менску.

На юбілейным вечары ў Дзяржтэатры.

На юбілейны вечар прышлі і «комсамольскія старычкі». Але іх усё-ж такі было малавата. Парадзелі іх шэрагі ў нашай арганізацыі. Шмат хто на партыйнай працы ў розных кутках Савецкага Саюзу, другія вучацца ў сталічных ВНУ. На іх месцы кожны год прыходзяць усё новыя і новыя кадры рабочай моладзі. Сярод сотак комсамольцаў лёгка пазнаць бышых спартакаўцаў, піонэраў. Яны ўжо даўно чырвоны гальштук зьмянілі на КІМ'аўскі значок.



Прэзыдыум юбілейнага сходу.

Але ўсе-ж «вэтэраны» на вечары адчуваліся. Вось зьбілася кучка хлапцоў вакол двух самых старых нашых комсамольцаў—Калмана Штэймана і Олікера. Хто з менскіх комсамольцаў іх ня ведае?

Штэйман і Олікер—сябры слаўнай комсамольскай «дванцаткі» 1918 году, з якой пасьля вырасьлі сотні ячэек.

Калі па вуліцах Менск ў новых шэранькіх касьцюмах шпацыравалі франтаватыя польскія паручнікі, Штэйман, Олікер і яшчэ такія-ж як яны зьбіраліся ў пахіліўшайся хатцы на глухой Тарговвай вуліцы—падпольны сход. Замест дакладаў і прамоў тут быў чуцен шэлест падпольных лістовак, якімі раніцай быў засыпан Менск.

З вінтоўкамі, галодныя і вашывыя, ішлі на Варшаву. Потым падаліся назад—на Смаленск. І вось ізноў у Менску.

Ну, а зараз здымай прастрэленую шынель—трэба працаваць на заводзе. А праз год--два пацягнуліся тысячы на рабфакі, у школы, за ведамі, за культурай. І гэта шлях ня толькі Штэймана, ня толькі Олікера—гэта шлях асноўных кадраў нашага комсамолу.

* * *

Было 7 гадзін вечару, калі ў цёмнай паўкруглай залі Дзяржтэатру лёгка адчынілася заслона.

На сцэне кастром гарэлі сьцягі, па баках рознаколёрнымі электрычнымі лямпачкамі былі напісаны дзьве блізкія даты—**1918—1927**. А ўнізе, пад першай датай, на чорных хаўтурных дошчачках гарэлі прозьвішчы тых, хто гэройска загінуў на шляху паміж гэтымі дзьвума датамі.

На вечары не гаварылі доўгіх прамоў, мала трывожылі гісторыю, а калі і ліліся шматлікавыя прывітаньні, дык у іх гучэла адна думка—комсамольскі фронт сёньня.

Красоўскі.—Фронт адказны. Цяжкі. За апошнія месяцы комсамолу прышлося адбіць сур'ёзную атаку. Троцкісты хацелі з 5-ці літараў—ЛКСМБ—выкрэсьліць адну, самую дарагую—першую літару. Але троцкісцкая атака адбіта.

І пад шумныя зьвінячыя воплескі тысячы прысутных комсамольцаў Красоўскі паведамляе аб тым, што ў Менскую організацыю за апошнія часы ўступіла 300 новых комсамольцаў—рабочых хлапцоў і дзяўчат.

Зачытваецца **прывітальная тэлеграма 15-му партыйнаму зьезду.** Па доўгіх чорных тэлеграфных правадох паплылі ў Маскву, у вялічэзную крамлёўскую залю словы 13-тысячнага комсамолу Меншчыны: **«Мы будзем верныя справе соцыялістычнага будаўніцтва».**

Пройдзены шлях застаўся за намі. Зараз комсамол ідзе да новых перамог. Аб гэтым гаварыў на юбілейным вечары прадстаўнік партыі—тав. **Палякоўскі.**

— На заводзе ў вас яшчэ ня ўсё добра з майстрамі, з дысцыплінай, вы яшчэ недастаткова добра вучыцеся, шмат цёмных плямаў у вашым штодзенным быту. Як бачыце, ёсьць неабсяжныя прасторы для энэргічнай дзейнай працы, шмат недахопаў трэба перамагчы.

На сцэне камісар кавалярыйскай дывізіі. тав. **Скараходаў.** Комсамольцы наладжваюць бурную овацыю тым, хто «ад тайгі да брытанскіх марэй—усіх мацней».

Камісар гаворыць аб узброеным комсамоле. Трэба проста сказаць, што ў чырвонаармейскіх шэрагах комсамольцы—лепшыя з лепшых. У іх і вінтоўка чысьцей, і на політзанятках хлапец актыўней.

І калі камісар загаварыў аб тым, што небясьпека вайна навісла над намі і хутка можа прыдзецца ізноў апрануць шынэль і ўзяць у рукі вінтоўку, перапоўненую залю ахапіла ваенная стратэгічная цішыня.

І раптам—сыгнальная труба... Юныя піонэры!

Стройным зьвяном узышлі яны на сцэну прывітаць юбіляраў. Прывіталі колектыўна—гучным вершам. Напісалі яго самі і ў простых радкох вобразна перадалі шлях комсамолу.

І калі малепькі лева-флянговы піонэрчык пранізьліва піскнуў «змагайцеся да канца»—комсамольцы засыпалі шумнымі воплескамі маладых дэкляматараў.

Потым выступалі старыя комсамольцы, сябры ЦК. Так, верна сказаў некалі Бязыменскі: «Я буду сед, но комсомольцем останусь юный н всегда». Яны і зараз комсамольцы, яны комсамольцамі застануцца заўсёды.

Якім Садоўскі.

Дзьве гадавіны.

На вечары ў студэнтаў.

Прайшло 6 год са дню організацыі вялізарнейшай у Менску комсамольскай ячэйкі **Белдзяржуніверсытэту.**

15 га сьнежня ў актавай залі БДУ адбыўся вечар, прысьвечаны юбілею ячэйкі і 9-й гадавіне ЛКСМБ.

Сакратар ячэйкі БДУ, адчыняючы вечар, кажа аб шляху, пройдзеным ячэйкай за гэтыя 6 год:

— Удзел у гаспадарчым будаўніцтве, барацьба за вучобу... Усюды, ва ўсіх праводзімых партыяй і савецкай уладай мерапрыемствах, ячэйка Белдзяржуніверсытэту была не на апошнім месцы. Да сучаснага моманту ячэйка яднае 750 комсамольцаў-студэнтаў. Вакол ячэйкі цесна згуртавана ўся беспартыйная студэнцкая моладзь. Праведзеная дыскусія аб тэзісах да 15-га зьезду УсеКП(б) паказала, што **ячэйка БДУ верна Ленінскай партыі, ідзе толькі з ёю.** Прыхільнікаў троцкісцкай опозіцыі ў ячэйцы не знайшлося.

Ад навуковых працаўнікоў Белдзяржуніверсытэту выступаў з прывітаньнем проф. **Вальфсон.**

Зьмена—піонэры атрадаў БДУ і акцябраты выступалі з колектыўнымі прывітаньнямі.

Заўсёды гатовы!—прагучэла ў перапоўненай актавай залі.

Вечар закончыўся пастаноўкай трупы Галубка **„Пінская Мадона“.**

М. З.

Ячэйкі сталіцы ў дні сьвята.

Была адна характэрная рыска ў тым, як нашы комсамольскія ячэйкі адзначылі 9-гадовы юбілей ЛКСМБ. Кожная ячэйка старалася прыдумаць нешта орыгінальнае, такую форму сьвята, якая яшчэ ня прыелася, ня была выкарыстана. У гэтых новых формах паказваліся нашы дасягненьні за 9 год, дробныя і вялікія недахопы ў працы.

Вечары адбыліся бадай ува ўсіх ячэйках комсамолу Менску.

Ячэйка саюзу нархарчаваньня сьвяткавала два сьвяты. 9-гадовы юбілей комсамолу Беларусі і 7-гадовы свайго існаваньня. Да вечару вышлі спэцыяльныя нумары насьценнай і сьветавой газэт.

Старэйшыя комсамольцы дзяліліся сваймі ўспамінамі аб першых днёх працы, аб першых гадох працы ўсяго комсамолу.

Комсамольцы **ячэйкі будаўнікоў** з'організавалі вялікае концэртнае аддзяленьне. На вечары выступіў балетны гурток клюбу КІМ. Некалькі комсамольцаў падзяліліся сваімі ўспамінамі.

Саюзныя навіны.

У ЦБЮП.

Сельска-гаспадарчая станцыя піонэраў. ЦБ ЮП і ЦК ЛКСМБ ухвалілі організаваць пры Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі **Цэнтральную Сельска-Гаспадарчую Піонэрскую Станцыю** ў мэтах лепшага кіраўніцтва сельска-гаспадарчай працай вясковых атрадаў.

На абсталяваньне станцыі будзе адпушчана 400 рублёў.

Ваенізацыя ў школах. ЦБ абмеркавала пытаньне аб ваенізацыі ў школах соцыяльнага выхаваньня.

Асноўнай формай масавай вайсковай працы ў школах павінны быць **ячэйка ОСА-Авіахіму.** Вакол апошняй ствараюцца розныя гурткі з вайсковым ухілам (стралковы і інш.), куды ўцягваюцца ўсе вучні.

Пашырыць піонэрскі друк. Разаслана паказаньне ўсім акруговым і раённым бюро ЮП аб вылучэньні ў атрадах упаўнаважаных па дзіцячаму друку.

У абавязак апошніх уваходзіць пашырэньне сярод піонэраў дзіцячага друку (газэт, часопісаў ды інш.).

Які атрад лепшы? ЦБ ЮП зараз падводзіць вынікі ўсебеларускага агляду піонэрскай організацыі, які праводзіўся ў верасьні і кастрычніку месяцах.

У хуткім часе адбудзецца раздача прэмій лепшым атрадам, якія маюць найбольш дасягненьняў у галіне паляпшэньня зьместу працы і г. д.

Кіно і дзеці. ЦБ вырашыла пытаньне аб наведваньні кіно дзяцьмі піонэрскага ўзросту.

Пастаноўлена дапушчаць 8-15-гадовых дзяцей толькі на тыя кіно-фільмы, аб якіх на афішах будзе наступная заўвага: „Дапушчаюцца дзеці да 16 гадоў“.

Сэсія ЦВК.

Прэзыдыум ЦВК БССР ухваліў адкласьці тэрмін скліканьня другой сэсіі ЦВК з 27-га сьнежня г. г. на 3-е студзеня 1928 г.

Раней вызначаны парадак дню дапоўнен дакладам тав. **Калініна** аб выніках працы па рацыяналізацыі савецкага апарату і далейшых задачах у гэтай галіне.

Абыйдземся без заграніцы.

Новыя фабрыкі і заводы.

У будучым годзе ВСНГ БССР прыступіць да пабудовы новых фабрык і заводаў у Беларусі.

Так, у Менску будзе пабудавана вялікая **галянтарэйная фабрыка;** яна будзе вырабляць тавары, якія дагэтуль атрымоўваліся выключна з-за мяжы.

У Гомелі вызначана пабудова новага **заводу сельска-гаспадарчых прылад і машын** з абсталяваньнем па апошнім слове тэхнікі.

Электрыфікацыя сельскай гаспадаркі.

Наркамзем Беларусі зараз складае плян электрыфікацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Згодна пляну, у гэтым годзе будзе патрачана на сельскае электра-будаўніцтва 500 тысяч рублёў. За гэтыя грошы ў розных раёнах Беларусі будзе пабудавана 14 новых электрастанцый.

Трактары для Беларусі.

У 1928 годзе Наркамгандаль атрымае для Беларусі 20 трактараў савецкай вытворчасьці.

Гэтыя трактары паступяць у распараджэньне Наркамзему і Белсельсаюзу для разьмеркаваньня на колектыўных гаспадарках, саўхозах і сельска-гаспадарчых арцелях.

Закупка завадзкой жывёлы.

Белсельтрэст адпусьціў 240 тысяч рублёў на закупку для Беларусі завадзкай скаціны, пераважна кароў.

Будзе закуплена Дацкая, Украінская і Яраслаўская завадзкая жывёла.

Выпуск чырвоных тэхнікаў.

7-га студзеня 1928 году адбудзецца чарговы выпуск віцебскага політэхнічнага тэхнікуму.

Будзе выпушчана 43 чырвоных тэхнікі. Пераважная большасьць з іх—партыйцы і комсамольцы.

Адчыніцца фабзавуч мэталістых.

У гэтым годзе мяркуецца адчыніць пры віцебскім заводзе „Мэтпром“ школу ФЗВ мэталістых.

Зараз пытаньне аб організацыі фабзавучу абгаворваецца ў належных установах.

Сярод пісьменьнікаў.

— У першых лічбах студзеня 1928 году адбудзецца 20-гадовы юбілей літаратурнай дзейнасьці пісьменьніка **З. Бядулі (Ясакара).**

— **Тодар Глыбоцкі** падрыхтаваў да друку зборнік крытычных артыкулаў аб сучасным становішчы беларускай літаратуры.

— **М. Грамыка** падрыхтаваў да друку дзьве свае поэмы, якія прыстасаваны аўтарам да пастановак на сцэне.

— Друкуецца і ў хуткім часе выйдзе ў сьвет новы зборнік вершаваных баек і гумарыстычных апавяданьняў **Крапівы.**

— Літкамісія Інбелкульту здала ў друк поўны збор твораў беларускай пісьменьніцы **А. Цёткі.**

— Вышаў з друку першы нумар часопісі **„Росквіт“**—орган Беларускай Літаратурна-Мастацкай Комуны.

— **Тарас Гушча** (Якуб Колас) заканчвае трэцюю і апошнюю частку сваёй аповесьці „У Палескай Глушы“, якая выйдзе з друку ў 1928 годзе.

— **Усебеларуская конфэрэнцыя маладнякоўцаў** склікаецца ў студзені 1928 году.

— Пры часопісі „Полымя“ сформавалася новае літаб'яднаньне, у склад якога ўвайшлі бліжэйшыя супрацоўнікі часопісі, а таксама вышаўшыя са складу „Маладняка“, т. т. **Чарот і Дудар.**

— Вышаў з друку зборнік фэльетонаў і гумарэсак маладнякоўца **Алёшы.**

Фото-вакно „Чырвонай Зьмены“.

На 15-м зьезьдзе УсеКП(б).



Комсамольская дэлегацыя на зьезьдзе. Другі зьлева—генэр. сакратар ЦК УсеЛКСМ т. Чапліп.

Паход маракоў Балтыцкага флёту.




9-га сьнежня ў раёне Чырвонага Сяла пад Ленінградам пачаўся зімовы паход маракоў Балтыцкага флёту сумесна з рабочымі гурткамі ТСА-Авіахіму. Паход праходзіць пад адзнакаю сувязі з сялянскім насельніцтвам. Ён зьяўляецца рэдкім выпадкам манэўраў марскога складу на сушы.

На здымку—маракі Балтфлоту перад вылазкай на лыжах.

Шахматы і шашкі

Задача № 16

П. Ліпкінда (Менск).



Белыя: Кр e7, Лe3, Cf2, Ca6, Kd3, пп: a3, f3. f4... (8)

Чорныя: Kp d4, Kd7. пп: b3, c4, c6, d5, f7... (7)

Мат у 2 хады.

Задача № 11 (шашачная)

І. Мазэля (Менск)

Белыя: D—d8, e7, пп: d2, e5, g1, g7... (6)

Чорныя: па3

Зачыніць прастую

Хроніка.

Для ўдзелу ў турніры гарадоў па перапісцы запісаліся каманды: Менску, Гомелю, Віцебску, Клімавічаў і Магілеву. Запіс працягваецца. (Запісацца можна ў шахсэкцыі ВСФКБ).

Для вучоту ўсіх шахматыстых і шашыстых Менску шахсэкцыя ВСФКБ разаслала па шахматна-шашачных гуртках гораду спэцыяльна-распрацаваныя анкеты.

Вясёлы куток.

У школе.

— **Мэтр паркалю каштуе 65 капеек. Колькі будзе каштаваць той-жа мэтр, калі цану зьнізяць на 50 проц.?**

— **Грош яму будзе цана таварыш настаўнік, бо якасьць паркалю зьнізяць на 100 процантаў.**

На аукцыоне.

— **Вэлёсыпэд 90 рублёў! Хто больш? 100! 110!**

— **Бачыў ты—хто больш?... Забыліся, што ў нас зьніжэньне цэн.**

Знойдзен:

— Комсамольскі білет за № 55249 на імя **Розінай Х. А.,** выдадзены Менакругкомам.

— Комсамольскі білет за № 1298, на імя **І. С. Цофіна,** выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

Радыё-навіны.

Новы перадатчык.

На Менскай радыё-станцыі імя Савнаркому БССР устаноўлен новы 4-кілёватны перадатчык, дзякуючы якому станцыя будзе чутна значна лепш у сэнсе дальнасьці, а таксама рэальнасьці перадачы.

У зьвязку з гэтым абсталявана новая студыя, адкуль перадаецца програма. Новая аудыторыя дазваляе павялічыць колькасьць адначасовых выканаўцаў.

Нядаўна радыё-станцыя атрымала лісты з радыё-станцый Украіны і Ленінграду, у якіх адзначаецца добрая якасьць перадач.

Пад кіраўніцтва Наркамасьветы.

З 1-га сьнежня ліквідавана прадстаўніцтва ў БССР таварыства Радыё-перадачы СССР. Усёй радыё-справай у нашай рэспубліцы будзе кіраваць Наркамасьветы.

Гэта дасьць магчымасьць кіраўнікам радыё-станцый шчыльней зьвязацца з масавым слухачом і здаволіць усе яго запатрабаваньні.

З 1-га студзеня значна зьмяняецца програма перадач.

На хвалі 1.170 мэтраў.

Менская радыё-станцыя імя Саўнаркома БССР.

Сёньня станцыя перадае наступную програму: 6 г. 00 хв.—гутарка **„Працоўная жанчына і абарона краю“,** 6 г. 30 хв.—**Радыё-газэта № 318,** 7 г. 10 хв.—гутарка **„Як капіталістыя і згоднікі клапоцяцца аб рабочай асьвеце“,** 7 г. 40 хв.— **Эспэранто па радыё,** 8 г. 10 хв.—**Концэрт.**

Заўтра перадаецца 6 г. 00 хв.—**Гутарка ўрача,** 6 г. 30 хв. **Радыё-газэта № 319,** 7 г. 10 хв.—гутарка **„Чарговая задача сельска-гаспадарчай коопэрацыі“,** 7 г. 40 хв.—**Концэрт ці трансьляцыя.**



Галоўлітбел № 24867.

Адказныя рэдактары: А. Бараньнікаў, А. Курцін

1-ая дзяржаўная друкарня.